# ЛІТАРАТУРНЫ ВІЦЕБСК

**Нагорскі Аляксандр Уладзіміравіч, Беларусь;**
**Захарава Вольга Дзмітрыеўна, Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык Ратынская Н.В.*

У дадзенай працы мы прапануем вам паглядзець на наш родны Віцебск зусім па-іншаму. Яшчэ ніколі назвы вуліц нашага роднага горада не разглядаліся як адлюстраванне літаратурнага жыцця Беларусі. Наша праца – спроба стварыць сапраўдны турыстычны маршрут.

*Ключавыя словы: Віцебскі літаратурны музей, Еўфрасіння Полацкая, вуліца Леніна, Еўдакія Лось, Краязнаўчы музей, Васіль Быкаў, Янка Купала, Уладзімір Караткевіч, Маскоўскі праспект, Пятрусь Броўка.*

# LITERARYVITEBSK

**NagorskiAlyaksandr,Belarus;**
**ZaharavaVolga, Belarus**
*Belarusian State Medical University*
*Belarus, Minsk*
*Scientificsupervisor– seniorlecturer Ratunskaya N. V.*

In this scientific work, we suggest you to look at our native Vitebsk quite differently. The street names of our native city have never been considered as a reflection of the literary life of Belarus. Our work is an attempt to create a real tourist route.

*Keywords: Vitebsk Literary Museum, Evfrosinia Polotskaya, Yanka Kupala, Lenin street, Evdokia Los, Local History Museum, Vasily Bykov, Vladimir Korotkevich, Moscow avenue, Petrus Brovka.*

Калі вы ўпершыню апынецеся ў старажытным горадзе Віцебску і не будзеце ведаць, з чаго пачаць знаёмства, то, верагодна, вы можаце і разгубіцца. Адчуць атмасферу горада, спазнаць яго традыцыі магчыма толькі вывучыўшы гісторыю. Для гэтага зусім не абавязкова дні і ночы праводзіць у бібліятэцы. Досыць вызначыць для сябе, які Віцебск вы жадаеце знайсці, з якім пазнаёміцца.

Можа, гэта будуць культавыя збудаванні, хоць гісторыя і падрыхтавала нялёгкі шлях для цэркваў Віцебска. А магчыма, вас зацікавіць архітэктура горада? Віцебск мае шмат выдатных мясцінаў. Вас можа зацікавіць мастацтва – гэта жыцце, гэта крыніца творчасці і развіцця. Быць у горадзе і не наведаць мясцовыя музеі і выставы – значыць не спазнаць нічога пра славутасці горада. Але куды б вы ні звярнулі свой позірк, перад вамі ва ўсёй красе паўстане дзіўны свет старадаўняга Віцебска, яго гісторыя.

Вам прапаноўваецца паглядзець на наш родны Віцебск зусім па-іншаму, бо ў лабірынтах шырокіх праспектаў шматпавярховых дамоў і ў вузенькіх вулачках прыватных нізенькіх дамкоў дыхае талентам і натхненнем Віцебск Літаратурны.

Актульнасць тэмы відавочная, таму што яшчэ ніколі назвы вуліц нашага роднага горада не разглядаліся як адлюстраванне літаратурнага жыцця Беларусі.Дадзеная работа – першая спроба стварыць турыстычны маршрут.

Репозиторий БГМУ

Трэба адзначыць, што праца над праектам – гэта праца на мяжы некалькіх дысцыплін (гісторыя, літаратурнае краязнаўства, беларуская літаратура).

Прадмет: творчая дзейнасць і жыццёвы шлях беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, імёны якіх носяць вуліцы г. Віцебска

Аб’ект: вуліцы горада Віцебска, звязаныя з іменамі беларускіх пісьменнікаў

Мэта: вывучэнне тапонімаў горада Віцебска, звязаных з імёнамі беларускіх пісьменнікаў і паэтаў

З дадзенай мэты вынікаюць наступныя задачы:

– прааналізаваць і выявіць назвы вуліц г. Віцебска, што носяць імёны беларускіх пісьменнікаў і паэтаў;

– распрацаваць турыстычны маршрут;

– прыцягнуць увагу моладзі да праблем беларускай культуры і літаратуры.

Падарожжа адбудзецца па турыстычным маршруце, які непасрэдна звязаны з імёнамі беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, якія даўно знаёмыя нам са школьных падручнікаў па літаратуры і гісторыі. І вас ўжо не будзе мучыць пытанне, што паглядзець ў Віцебску, і вы не станеце задумвацца, з чаго ж пачаць першае знаёмства з горадам. Запрашаем у падарожжа!

Наша экскурсія, безумоўна, пачынаецца ад Віцебскага літаратурнага музея, які размешчаны ў будынку помніка архітэктуры XIX стагоддзя. У музеі сабраны матэрыялы пра знакамітых асветнікаў Беларусі, такіх як Еўфрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Сімяон Полацкі.

А зараз пройдзем далей па цэнтральнай вуліцы Віцебска – вуліцы Леніна – і каля Абласной бібліятэкі ўбачым помнік Еўдакіі Лось, таленавітай паэткі, памяць аб якой так пяшчотна захоўваецца на Віцебшчыне.

Далей кіруемся да Краязнаўчага музея. Менавіта тут можна ўбачыць мемарыяльную дошку ў гонар народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Яна ўпрыгожыла будынак дзіцячай мастацкай школы №1 па вуліцы Суворава, 3.

Працягваем свой шлях па вуліцы Янкі Купалы, які па вышыні паэтычнай тэхнікі, па мове, па разнастайнасці тэм, па майстэрству не мае сабе роўных у гісторыі беларускай літаратуры. Велізарнае значэнне мела паэтычная дзейнасць Купалы і для развіцця беларускай літаратурнай мовы.

Няспешна падыходзім нашай грамадою да плошчы Леніна, на ўскрайку якой у засені старых дрэў узвышаецца незвычайны помнік – помнік Уладзіміру Караткевічу. Уладзімір Сяменавіч Караткевіч – класік беларускай літаратуры, паэт, празаік, драматург, публіцыст.

А для працягу нашай экскурсіі мы запрашаем вас у аўтобус. Наступны наш прыпынак – вуліца Петруся Броўкі. Яна крыжуецца з Маскоўскім праспектам і вуліцай Церашковай. На гэтам скрыжаванні і ўзвышаецца помнік славутаму паэту. Пятрусь Броўка – паэтычны летапісец народнага жыцця, таленавіты паэт.

Мы шмат падарожнічалі сёння, і нашы сляды назаўсёды застануцца ў памяці віцебскіх вуліц. Але ўжо час вяртацца ў цэнтр нашага горада,а там і да

Репозиторий БГМУ

чыгуначнага вакзала недалёка. Шчаслівай дарогі, паважаныя госці, будзем рады сустрэцца з вамі яшчэ, бо расказваць пра наш унікальны горад можна бясконца.

Такім чынам, мы даследавалі мясціны горада Віцебска, непасрэдна звязаныя з імёнамі беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. На гэтай аснове склалі турыстычны маршрут з кароткімі каментарыямі да яго.

Работа мае вялікае практычнае і выхаваўчае значэнне, спрыяе пашырэнню кругагляду моладзі,выхоўвае любоў да роднай зямлі і культуры.